# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 14 верасня 1998 года, панядзелак, № 12 (1785)


РЭПАРТАЖ У НУМАР

# ВІВАТ, СТУДЭНТ!

## Новы навучальны год, а разам з ім і новы сезон дыскатэк і вечарын распачаўся студэнцкім святам на плошчы Незалежнасці

*Хоць завадзілам свята і стаў самы вясёлы і вынаходлівы з універсітэтаў — БДУ — на чале з самым дасціпным рэктарам рэспублікі Аляксандрам Уладзіслававічам Казуліным, грандыёзнае шоў "Віват, студэнт!" з першых жа хвілін зрабілася набыткам усіх сталічных студэнтаў.*




На плошчу выязджаюць рыцары

Канцэрт беларускіх эстрадных выканаўцаў "Зорная ростань", універсітэцкіх ансамбляў і звышпапулярнага расійскага гурта "На-на" — якраз тое, што можа выклікаць асаблівую цікавасць пасля шэрага беларускага лета. Здаецца, Дзень ведаў здолеў нагадаць юнацкім сэрцам, што яны ўсё яшчэ гарачыя, а замёрзлыя твары зрабіць вясёлымі — добры пачатак навучальнага года.

Дзейства ладзілася ў гонар амаль дзвюх тысяч першакурснікаў БДУ каля не самых старажытных, але вельмі годных сценаў іх альма-матэр. Да сцэны паважліва рухаліся коні з рыцарамі часоў сярэднявечча, якія трымалі ў руках харугвы — атрыбутыку факультэтаў. За воінамі па калідоры прайшоў рэктар Аляксандр Уладзіслававіч Казулін, які душэўна і шчыра павіншаваў першакурснікаў, усіх астатніх студэнтаў і сваіх калег з пачаткам новага навучальнага года. Не абыйшлося без "шпаргалак" і падказак. Клятву, у якой першакурснікі паабяцалі ветру і хмарам "з годнасцю насіць ганарлівае званне студэнта БДУ", яны дакладна, слова ў слова паўтаралі за рэктарам. Што ж, у першы дзень такое дазваляецца. А прыйдзе сесія — самі пабачыце!

Дзейства вызначалася выключнай дэмакратычнасцю: побач з саліднымі дэканамі факультэтаў ганарліва стаялі "зялёныя" першакурснікі, ні ў чым не саступалі прафесійным манекеншчыцам універсітэцкія прыгажуні, каранаваныя тытулам "Міс БДУ — 98". Дый "Крыжачок" рухаўся па сцэне нікольки не горш за "завадных" "нанайцаў", якім асобныя "дзякуй" за тое, што не толькі наведалі свята, але і амаль дзве гадзіны не давалі публіцы сумаваць.

Непагадзь ніколькі не сапсавала студэнцкі настрой. Дарэчы, мне ўдалося высвятліць, што кожны з прысутных прыйшоў на плошчу са сваім патаемным жаданнем. А Пятро (пяцікурснік факультэта міжнародных адносін) шчыра прызнаўся:

— Я ўвогуле нікуды не ішоў. Сядзеў і думаў, ці мыць у інтэрнаце падлогу. І калі мыць, то сёння ці заўтра? А тут прыходзяць мае сябры і прапануюць пайсці на свята. Я і пайшоў. А тут атрымаў павязку і выконваю абавязкі старшыні Студэнцкага саюза на нашым курсе. Калі сказаць па праўдзе, дык мы, пяцікурснікі, і дэканат з'яўляемся асновай стабільнасці і парадку на ўсім нашым факультэце.

Чаго чакалі ад гэтага вечара розныя людзі, якім давялося ўдзельнічаць у праграме ці прымаць віншаванні? "Чагосьці неверагодна прыгожага", — паведамілі мне студэнткі геафака. "Гурта "На-на", — не стала хітраваць навучэнка аднаго з мінскіх вучылішчаў. "Выступленняў, конкурсаў, магчымасці пакрычаць", — удакладнілі студэнты тэхналагічнага інстытута. "Не хацелася б захварэць", — перасцерагаліся ўдзельніцы ансамбля "Харошкі". Дарэчы, за сцэнай і сапраўды было вельмі холадна. Асабіста я назвала б выхад на сцэну ў такіх прыродных умовах проста гераічным учынкам. І з сямі вечара да паўночы студэнты мелі выдатную магчымасць пазнаёміцца з гэтымі героямі нашага часу: "Харошкі", "Неруш", "Крыжачок", "Літарынка"...

Гэта праз некалькі тыдняў выкладчыкі будуць ацэньваць веды ўчарашніх абітурыентаў, а 1 верасня менавіта на суд студэнцкага журы выходзілі на сцэну беларускія выканаўцы. Самую высокую адзнаку, па ўсім было відаць, атрымаў рок-гурт "Пані Хіда". Нават за сцэнай падчас яго выступлення многія не маглі ўтрымацца на месцы і пачалі танцаваць. А на той момант за кулісамі было шмат вясёлых і вынаходлівых нашых хлопцаў, прыгожых дзяўчат Сашы Варламава. А яшчэ ў сваім аўтобусе рыхтаваўся да выступлення гурт "На-на". Калі Таццяна Сулімава з "Радыё Рокс" аб'явіла аб выхадзе "нанайцаў", многія з натоўпу на плошчы ў такі цуд проста не паверылі: "Што, сапраўды жывыя?"

Сярод іншых падзей святочнага вечара можна адзначыць спробу правесці акцыю масавага пацалунку. Спробу, таму што не зусім атрымалася — беларускія студэнты аказаліся больш закамплексаванымі, чым разлічвалі арганізатары. Хаця пераможцаў і ў гэтай справе вызначылі: студэнтку медыцынскага інстытута і хлопца, які адрэкамендаваўся хатняй гаспадыняй. Настрой быў канчаткова ўзняты яшчэ і раскручваннем прызоў ад "Кока-колы".

Ва ўсім, што датычыць дзейнасці арганізатараў, свята прайшло як след. Большасць удзельнікаў пакінулі плошчу Незалежнасці толькі тады, калі ўжо існавала пагроза не паспець на апошнюю электрычку ў метро.

А некаторым асабліва вясёлым хлопцам я хацела б нагадаць пра будучыню. Яны, магчыма, лічаць, што разгойдванне і разварушванне натоўпу пакідае ва ўсіх удзельнікаў гэтай працэдуры прыемныя ўражанні. Запэўніваю, хаця ўражанні і незабыўныя, прыемнымі яны застаюцца не для ўсіх. Нават калі не звяртаць увагу на сіпякі і згубленыя сумачкі, зламаныя парасоны і раскудлачаныя прычоскі, ігнараваць страчаны абутак не з'яўляецца магчымым. А паколькі вяртацца дамой у адным чаравіку вельмі цяжка, вялікая просьба да ўсіх аматараў арыгінальнасці: гойдайцеся, калі ласка, сам-насам дзенебудзь далей ад людзей.

Валерыя АЎСЯНІК



Прадстаўніцы беларускай эстрады выглядалі ніколькі не горш за "нанайцаў"



Гэтай "шпаргалкай" з падказкі самога рэктара карысталіся першакурснікі, калі вымаўлялі словы сваёй клятвы

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

## НЕАДУКАВАНЫЯ ЭКСПЕРТЫ — КРАХ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ. ІХ ЧАС ДАЎНО ПРАЙШОЎ, ТАМУ ШТО З'ЯВІЎСЯ Ў КРАІНЕ ФАКУЛЬТЭТ, ДЗЕ БУДУЦЬ РЫХТАВАЦЬ ЭКАНАМІСТАЎ САМАГА ШЫРОКАГА ПРОФІЛЮ

*Неяк у адным са сваіх артыкулаў саветнік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Міхаіл Міхайлавіч Кавалёў адзначыў, што ў сучасных эканамічных праблемах нашай краіны вінаватая савецкая сістэма адукацыі: яна не дала зладжаных і сістэмных ведаў шматлікім саветнікам і экспертам палітыкаў, закліканых прымаць рашэнні. Цяпер на долю Міхаіла Міхайлавіча выпала магчымасць свае ідэі па ўдасканаленню эканамічнай адукацыі рэалізаваць не на словах, а на справе. Таму што, нарэшце, прынята рашэнне аб стварэнні ў БДУ эканамічнага факультэта. Доктар навук, прафесар Кавалёў прызначаны яго дэканам-арганізатарам.*

**— Чаму ўзнікла неабходнасць аб'яднання існуючых на розных факультэтах універсітэта груп эканамістаў у самастойны факультэт?**

— Няма ніводнага універсітэта ў свеце, у якім не было б эканамічнага факультэта. Звычайна гэта самыя вялікія і самыя прэстыжныя факультэты. Тое, што ў БДУ да гэтай пары не было самастойнага эканамічнага факультэта, нават дзіўна. Аднак лепш позна, чым ніколі. На сённяшні дзень ужо не толькі прынята рашэнне аб стварэнні паўнацэннага эканамічнага факультэта, але і практычна падрыхтавана яго канцэпцыя. Яна ў значнай ступені адказвае на пытанне, чаму патрэбны яшчэ адзін эканамічны факультэт у рэспубліцы. Не толькі таму, што прэстыжна. Эканамістаў самага шырокага профілю з фундаментальнай універсітэцкай адукацыяй, якія б добра маглі спалучаць веданне тэорыі і практыкі эканомікі, працаваць экспертамі, саветнікамі ў Савеце міністраў, міністэрствах эканомікі альбо фінансаў, Нацыянальным банку, нарэшце, быць проста лідэрамі бізнесу,— на мой погляд, такіх спецыялістаў шматлікія эканамічныя факультэты шматлікіх іншых вышэйшых навучальных устаноў яшчэ не рыхтавалі. У нас захоўвалася традыцыя эканамічнай адукацыі па канкрэтных напрамках: эканаміст лёгкай прамысловасці, эканаміст машынабудавання, аўдытар, банкаўскі работнік. А ва ўсім свеце прынята рыхтаваць эканамістаў з глыбокім веданнем асноўных заканамернасцей эканамічнага развіцця, эканамічных працэсаў. Таму мы ствараем канцэпцыю, арыентаваную на падрыхтоўку спецыяліста-аналітыка максімальна шырокага профілю з глыбокімі тэарэтычнымі ведамі, але здольнага працаваць у практычнай эканоміцы.

**— Такім чынам, на факультэце не будзе існаваць жорсткай спецыялізацыі?**

— Зразумела, спецыялізаваныя кафедры па макраэканоміцы, мікраэканоміцы, фінансаваму менеджменту і другія будуць, таму што эканоміка. як і любы прадмет, мае спецыялізаваныя навуковыя накірункі. Што ж датычыцца тэарэтычнага і практычнага аспектаў, то толькі здольнасці чалавека і яго характар вызначаюць, стане ён навукоўцам-аналітыкам ці практыкам. Ранняя спецыялізацыя на тэорыю эканомікі і менеджмент, мне здаецца, не патрэбна.

**— А вы не баіцеся канкурэнцыі з боку недзяржаўных навучальных устаноў, якія кан'юнктуру рынку ўлавілі даўно? Магчыма, лепшыя выкладчыкі эканомікі даўно знайшлі сабе задавальняючае іх месца працы?**

— Не баімся. Лепшыя сілы эканамічнай навукі выкладаюць адразу ў некалькіх навучальных установах і яшчэ кансультуюць з дзесятак фірм. І не без іх дапамогі мы здолеем стварыць збалансаваны вучэбны план, які б улічваў усе асноўныя накірункі эканамічнай тэорыі і практыкі. Недахоп жа многіх камерцыйных ВНУ ў тым, што, атрымаўшы аднаго-двух моцных выкладчыкаў, кіраўніцтва стварае "пад іх" цэлы факультэт. Так атрымліваецца, што на належным узроўні выкладаюцца толькі прывабныя навамодныя прадметы, а іншыя дысцыпліны не маюць дастатковай глыбіні.

**— На якіх "кітах" грунтуецца сёння эканамічная адукацыя?**

— Студэнт-эканаміст павінен мець глыбокія веды па эканамічнай тэорыі, па гісторыі эканамічнай думкі, эканамічнай статыстыцы. Але добраму спецыялісту адной толькі эканомікі недастаткова. Важна ўмець выкарыстоўваць матэматычныя мадэлі, якія апісваюць эканамічныя працэсы. Вось вам прыклад: практычна ўсе апошнія лаўрэаты Нобелеўскай прэміі па эканоміцы — напалову матэматыкі. Сёння любы сур'ёзны падручнік па эканоміцы амаль на кожнай старонцы мае матэматычныя формулы. Студэнту-эканамісту абавязкова трэба авалодаць таксама інфармацыйнымі тэхналогіямі. Эканоміка заўсёды мае справу з вялікімі статыстычнымі аб'ёмамі даных, таму прымаць аптымальныя рашэнні можна толькі з дапамогай камп'ютэра. А ва ўмовах невялікай дзяржавы з адкрытай эканомікай (якой і з'яўляецца Беларусь) мы можам прадаваць свае тавары амаль на семдзесят працэнтаў толькі на знешнім рынку. І не толькі ў Расіі. Такім чынам, кожны выпускнік нашага факультэта павінен прыстойна валодаць англійскай мовай, каб самастойна весці перагаворы, свабодна чытаць статыстычныя даведнікі па коштах, па фінансавых рынках свету. Калі спецыяліст, акрамя выдатнага ведання эканомікі, авалодае і гэтымі інструментамі, ён будзе карысным для нашай гаспадаркі.

І яшчэ, нельга стаць спецыялістам у гэтай сферы, не валодаючы эканамічнай інтуіцыяй, не маючы адчування, як дзейнічае ўся эканоміка ў свеце, як патокі тавараў перамяшчаюцца з адной краіны ў другую, ператвараючыся ў тэхналогіі і сучасныя прадукты. У спецыялістах-аналітыках з такой інтуіцыяй мае патрэбу не толькі дзяржава ў цэлым, але і кожнае асобнае прадпрыемства, для паспяховай дзейнасці якога неабходна праводзіць даследаванне рынкаў, вывучаць тэндэнцыі іх развіцця, прагназаваць эканамічныя працэсы ў суседніх дзяржавах.

**— Хто ж будзе рыхтаваць будучых беларускіх лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі па эканоміцы?**

— Не думаю, што толькі універсітэцкія выкладчыкі. Зараз ідзе ўжо размова аб фарміраванні некалькіх новых кафедраў па нетрадыцыйных для нас накірунках. Скажам, фінансавы менеджмент, эканамічная інфарматыка, матэматычная эканоміка. Мы пойдзем шляхам прыцягнення спецыялістаў-практыкаў і тэарэтыкаў, якія назапасілі ўжо значны вопыт. Апошнія чатыры гады я кансультую банкаўскую сферу і ведаю многіх з іх. Зразумела, што асабліва па першым часе нам не абыйсціся без дапамогі замежных вучоных. Думаю, што мы знойдзем падтрымку ў розных фондах, якія дапамогуць нам запрасіць хаця б на кароткія тэрміны вядомых вучоных-спецыялістаў для чытання лекцый. Між іншым, яны могуць дапамагчы і ў стварэнні базы — сучаснай эканамічнай бібліятэкі, дзелавых гульняў, навучальных праграм для эканамістаў. Мы звярнуліся з такой просьбай да замежных універсітэтаў: нямецкіх, французскіх, амерыканскіх. І атрымалі ўжо некалькі станоўчых адказаў.

**— Але ўсё ж, пагадзіцеся, Беларусь ідзе ў эканоміцы сваім шляхам. Улічваць міжнародны вопыт — гэта добра, толькі вашым выпускнікам — "уздымаць" эканоміку ў неардынарных умовах...**

— Вы закранулі вельмі глыбокае пытанне. Сённяшні прыклад Расіі паказвае, што механічнае запазычанне догмаў рыначнай эканомікі настолькі ж шкоднае, як і догмы сацыялістычнай эканомікі. Аказваецца, не ўсё так проста. Рыначная інфраструктура была створана ў Расіі, але калі ўся прамысловасць у развале, гэтага недастаткова. А патрэбна, асабліва ў пераходны перыяд, разумнае спалучэнне і таго, і другога, што, на мой погляд, у значнай ступені і адбываецца ў беларускай мадэлі, якую так часта крытыкуюць. Але тое, што расіяне робяць цяпер, каб выйсці з крызісу, фактычна адзін у адзін скапіравана з таго, што на Беларусі рабілі ўжо два гады назад.

Тэорыя пераходнай эканомікі, на мой погляд, толькі зараз пачынае складвацца. Тут, безумоўна, карысны вопыт добрых двух дзесяткаў дзяржаў, якія зараз знаходзяцца на розных стадыях пераходнага шляху. У нас ужо наладжаны кантакты з цэнтрам Бальцаровіча ў Варшаве і з іншымі цэнтрамі ў свеце па вывучэнню пераходных працэсаў у эканоміцы. Беларускі шлях таксама варты навуковага вывучэння, таму што ён дастаткова арыгінальны. Пры ўсіх дапушчаных памылках і на ранніх стадыях трансфармацыі беларускай эканомікі, і сёння многае з нашага вопыту можа быць карысным нават для міжнародных эканамічных інстытутаў, таму што лепш за ўсё адпрацоўваць новыя эканамічныя мадэлі, параўноўваючы, як трансфармуецца адна эканамічная сістэма ў другую на розных практычных рэалізацыях у Беларусі, Расіі, Малдове, Кыргызстане... Думаю, што было б нядрэнна, калі б удалося стварыць кафедру тэорыі пераходнай эканомікі на нашым факультэце, якая б распрацавала навуковую і навучальную праграмы па трансфармацыі эканамічных працэсаў. У яе межах можна было б кансалідаваць сілы ўсіх вучоных-эканамістаў універсітэта, Акадэміі навук, практыкаў для глыбокага навуковага абгрунтавання, выпрацоўкі стратэгіі і тактыкі эканамічных рэформаў Рэспублікі Беларусь.

Дарэчы, у БДУ існуюць дастаткова прыстойныя традыцыі эканамічнага навучання. Больш за 25 гадоў тут рыхтавалі выкладчыкаў палітэканоміі сацыялізма і капіталізма, і я калісьці працаваў з гэтымі групамі. Лепшыя сілы эканамістаў-аналітыкаў у рэспубліцы сёння — якраз выпускнікі 70-80-х гадоў. Гэта і кандыдат эканамічных навук Валерый Дашкевіч ("Белгазпрамбанк"), і доктар эканамічных навук Людміла Пятроўская (БДУ), і дактарант Уладзімір Усоскі ("Інкамбанк"), і доктар эканамічных навук Давыдзенка (кансультант прэм'ера), і доктар эканамічных навук Ірына Новікава (БДУ), і кандыдат эканамічных навук Валянцін Шухно (кіраўнік Камітэта па каштоўных паперах), і шмат іншых. Сёння ёсць дзве групы на ФЭФ, якія потым стануць касцяком новага факультэта. Ёсць групы матэматыкаў-эканамістаў па спецыяльнасці "Эканамічная кібернетыка". Ёсць рэдкая ў нас, але папулярная ва ўсім свеце спецыяльнасць "Актуарная матэматыка". Важна толькі кансалідаваць гэтыя сілы, не аб'ядноўваючы нават студэнтаў у рамках аднаго факультэта. Каб лектар, які на сённяшні дзень можа лепш за ўсіх прачытаць актуарную матэматыку, чытаў яе ўсім студэнтам універсітэта. Мы б хацелі прыцягнуць для чытання лекцый на гэтым факультэце лепшых спецыялістаў у галіне эканомікі.

**— Па якіх праграмах будуць вучыцца студэнты вашага факультэта?**

— Я думаю, што для галоўнага універсітэта краіны патрэбна індывідуальная праграма. Яна ўжо амаль распрацавана. Не буду ўтойваць: калі мы над ёй працавалі, то ў значнай ступені арыентаваліся на праграмы эканамічных факультэтаў Гарвардскага і Маскоўскага універсітэтаў. На мой погляд, яны найбольш адэкватныя нашым інтарэсам, мэтам і задумам.

Да пачатку навучальнага года мы выдадзім канспекты лекцый па асноўных прадметах. Па дапаможніку "Фінансава-эканамічныя разлікі, аналіз інвестыйцый і кантрактаў" можна пачынаць вучыцца хоць сёння. Вядзецца падрыхтоўка такога ж дапаможніка па эканамічнай дыягностыцы і (пры падтрымцы Асацыяцыі беларускіх банкаў) вучэбнага дапаможніка пад назвай "Грашова-крэдытная палітыка пераходнага перыяду", а таксама шасцітомніка сумесна з Франкфуртскай банкаўскай акадэміяй.

Дарэчы, будучы факультэт з поспехам зможа займацца перападрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі кадраў па асобных, вельмі патрэбных для народнай гаспадаркі спецыяльнасцях. Ужо ёсць прапанова па падрыхтоўцы спецыялістаў па фондаваму рынку і інвестыцыях, заяўкі банкаўскай сістэмы па падрыхтоўцы спецыялістаў па стратэгічнму планаванню банкаўскай дзейнасці — аналітыкаў банка. Зразумела, што мы не будзем займацца падрыхтоўкай спецыялістаў не універсітэцкага профілю. Іншая справа, што факультэту трэба мець цесныя сувязі з каледжамі эканамічнага профілю. Лепшыя студэнты сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў змогуць тады паступаць ва універсітэт, мінуючы пачатковыя курсы. І ва ўсім свеце, наколькі я ведаю, падобныя каледжы — структурныя падраздзяленні універсітэта.

**— А што падштурхнула Вас, спецыяліста-практыка, заняцца праблемамі эканамічнай адукацыі?**

— Сапраўды, апошнія пяць гадоў я працаваў у практычнай эканоміцы, дапамагаючы выпрацоўваць эканамічную палітыку дзяржавы. Спачатку саветнікам старшыні Вярхоўнага Савета, потым — у Асацыяцыі беларускіх банкаў, цяпер саветнікам Старшыні праўлення Нацыянальнага банка. І я бачыў, што эканамічныя памылкі падчас прыняцця рашэнняў абыходзяцца дзяржаве і народу вельмі дорага. Два-тры промахі ўрада Кірыенкі будуць каштаваць цяпер Расіі мільярды долараў. Памылкі ж гэтыя — часта вынік не зламыснасці чыноўнікаў, а недахопу, несістэмнасці эканамічнай адукацыі. Маючы цалкам добрыя намеры, але сканцэнтраваўшыся толькі на адным аспекце, людзі не разумеюць, што, гіпертрафіруючы адзін з працэсаў, наносяць шкоду ў іншым месцы. Эканоміка заўсёды ўзаемазвязана. У ёй усё павінна быць збалансавана, і нельга блытаць наступствы і прычыны. Мне заўсёды хацелася папрацаваць над выпраўленнем гэтай самай небяспечнай для эканомікі памылкі — няўвагі да адукацыйных працэсаў. На мой погляд, маладыя людзі ў нашай краіне нават шляхам самаадукацыі даходзяць да патрэбнага ўзроўню. Трэба толькі дапамагчы ім хутчэй гэта зрабіць. Добра паставіўшы эканамічную адукацыю, якая б не была адарваная ад рэальнага, мела разумны баланс тэорыі і практыкі, мы здолеем падрыхтаваць выдатных спецыялістаў.

*Гутарыла*
*Марына ЗАГОРСКАЯ*

СУСТРЭЧЫ

## Найвядомейшы харэограф сучаснасці

*Гэтае паведамленне, напэўна, прыцягне ўвагу як заўзятых балетаманаў, так і ўсіх, хто неабыякавы да працэсу ўзыходжання беларускай культуры на новыя творчыя вышыні, на сусветны ўзровень.*

28 верасня пройдзе сустрэча народнага артыста СССР, лаўрэата мноства нацыянальных і міжнародных прэмій, аднаго з найвядомейшых харэографаў сучаснасці, дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Валянціна Мікалаевіча Елізар'ева са студэнтамі, выкладчыкамі і супрацоўнікамі Белдзяржуніверсітэта.

Героя сустрэчы не трэба прадстаўляць: жыццё і творчы шлях яго выклікае ўсеагульную цікавасць, павагу, прызнанне. Гутарка ж пойдзе пра тыя адвечныя маральна-этычныя праблемы, што хвалююча і пераканаўча адлюстраваны ў яго пастаноўках, пра погляды на жыццё і сучаснасць, пра міжнароднае жыццё тэатра, які даўно ўжо з'яўляецца візітнай карткай Беларусі ва ўсім свеце. І, вядома ж, пра творчыя планы і задумы.

Мерапрыемства падтрымлівае старую і вельмі карысную традыцыю, што склалася ў БДУ: ладзіць сустрэчы з выдатнымі дзеячамі ў грамадска-палітычнай, навуковай, культурнай сферах. Мы запрашаем усіх зацікаўленых.

Нагадаем месца і час: 28 верасня (панядзелак) у 14.30 на факультэце міжнародных адносін — вул. Акадэмічная, д. 25, аўдыторыя 403.

*Студэнцкі саюз БДУ,*
*Дырэкцыя па справах культуры*

ВЫСТАВЫ

## Вяртанне Міцкевіча

У навуковай чытальнай зале для прафесарска-выкладчыцкага саставу і аспірантаў (галоўны корпус, 2-гі паверх фундаментальнай бібліятэкі БДУ) адкрылася выстава, прысвечаная 200-годдзю з дня нараджэння вялікага паэта Адама Міцкевіча.

На выставе прадстаўлены творы Адама Міцкевіча, матэрыялы гісторыі жыцця і творчасці паэта, пераклады твораў і літаратуразнаўчых прац пра пісьменніка, зборнікі артыкулаў, прысвечаных Міцкевічу і яго паэтычнай спадчыне, вершы беларускіх аўтараў пра Міцкевіча, а таксама бібліяграфія "Адам Міцкевіч у друку Беларусі".

*В. Ф. ЛЮБАЛЬ,*
*Вядучы бібліятэкар*

# Самыя першыя

Так атрымалася, што самыя першыя шчаслівчыкі, якія, вытрымаўшы з гонарам уступныя экзамены, сталі студэнтамі-першакурснікамі, паявіліся менавіта ў Белдзяржуніверсітэце. І хоць колькасць жадаючых паступіць у вядучую вышэйшую навучальную ўстанову краіны перавышала колькасць бюджэтных месцаў больш чым у тры разы, будзем спадзявацца, што і расчараваных было некалькі менш, чым у іншых ВНУ. Па-першае, тыя, хто не прайшоў па конкурсу, мелі магчымасць усё ж такі здзейсніць сваю мару і стаць студэнтамі-платнікамі. Па-другое, у іх заставалася яшчэ спроба штурму сценаў іншых інстытутаў і універсітэтаў, таму што ў Белдзяржуніверсітэце абітурыенцкая кампанія адгула за некалькі дзён да яе пачатку ў маштабах усёй краіны.

Прыём студэнтаў на дзённую бюджэтную форму навучання адбываўся па 47 спецыяльнасцях на 15 факультэтах. Агульны конкурс да пачатку экзаменаў складаў у БДУ больш за тры чалавекі на месца, на завочнай бюджэтнай форме навучання ён быў крыху меншым — 1,63. Накал барацьбы падчас экзаменаў імкліва ўзрастаў. Пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці ад здачы ўступных экзаменаў вызваляліся пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, а таксама алімпіяды "Абітурыент БДУ-98". Без уступных экзаменаў і па выніках тэсціравання медалістаў ва універсітэт былі залічаны адразу 593 чалавекі. Адначасова пасля першага ж экзамену назіраўся вялікі адсеў тых, каму не пашанцавала. Дарэчы, двойку па адным з экзаменаў атрымаў кожны пяты абітурыент, што сведчыць не толькі аб прынцыповасці універсітэцкіх выкладчыкаў, але і аб дрэннай падрыхтоўцы ўчарашніх школьнікаў. Многія медалісты не змаглі даказаць "золата" сваіх атэстатаў. Сярод 2440 з іх вытрымалі конкурс толькі 996. 8 працэнтаў медалістаў увогуле атрымалі двойкі.



Першакурснікі падчас правядзення Дня ведаў

Пасля правядзення ўсіх уступных экзаменаў агульнай колькасцю 12 687 склаўся конкурс амаль два чалавекі на месца. Падчас прыёмнай кампаніі абітурыентамі было атрымана 1413 пяцёрак.

Самым складаным экзаменам аказалася фізіка. Па ёй атрымана 40 працэнтаў двоек, следам за ёй ідзе матэматыка і біялогія. Самай паспяховай была здача экзаменаў па прадметах "Чалавек і грамадства" і замежная мова. І яшчэ адно назіранне: абітурыенты, якія здавалі экзамен па беларускай мове, вытрымалі яго больш годна, чым іх "рускамоўныя калегі".

Самымі папулярнымі сярод абітурыенцкай брацііі былі факультэты — юрыдычны, міжнародных адносін, філасофска-эканамічны і журналістыкі. Але калі ў мінулым годзе значна вылучаліся спецыяльнасці па псіхалогіі, то цяперашнія абітурыенты аддалі перавагу сацыялогіі. Асаблівым попытам карысталася таксама аддзяленне інфармацыі і камунікацыі, а таксама сучаснай англійскай мовы і літаратуры. На неверагодна складаныя, але вельмі прэстыжныя ў сучасны момант спецыяльнасці: актуарная матэматыка, эканамічная кібернетыка, радыёфізіка — смельчакоў было няшмат. Дый камплектуюцца яны пераважна з пераможцаў алімпіяд ці арыентаваных на гэтыя дысцыпліны медалістаў.

Аб добрай славе, што ідзе пра Белдзяржуніверсітэт далёка за межамі нашай краіны, сведчыць і той факт, што ў гэтым годзе сюды паступалі 78 расійскіх хлопцаў і дзяўчат. 13 з іх сталі студэнтамі.

Падчас кожнай прыёмнай кампаніі знаходзяцца шчасліўчыкі і расчараваныя. Для апошніх заўсёды прадугледжаны шанц паправіць становішча, падаўшы апеляцыю. На гэты раз па ўсіх прадметах іх было пададзена 47. У дзесяці выпадках пасля перагляду адзнака была павышана. Дарэчы, за час ажыццяўлення кантролю за работай прыёмнай камісіі і правядзеннем уступных экзаменаў у БДУ дзяржаўнай камісіяй не было ўстаноўлена парушэнняў з боку прыёмнай камісіі заканадаўчых і нарматыўных актаў.

Вынікі ўступных экзаменаў, аналіз якасці выканання пісьмовых работ і вусных адказаў абітурыентаў сведчаць аб дастаткова высокім узроўні падрыхтоўкі тых, хто атрымаў-такі права называцца студэнтам БДУ, у тым ліку і на платным навучанні. Найбольш падрыхтаванымі аказаліся абітурыенты, якія скончылі ліцэй пры БДУ, ліцэі, гімназіі і спецыялізаваныя школы 8, 19, 32, 61, 74, 79,.37 горада Мінска. Дарэчы, не адсталі ад іх выпускнікі сярэдніх школ Ліды, Гродна, Віцебска.

*Марына Аверкіна*

КОНКУРС

# ПАТРАБУЮЦЦА ТАЛЕНАВІТЫЯ НАВУКОЎЦЫ!

*Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў абвяшчае конкурс праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў для маладых навукоўцаў "Навука-98М".*

*У конкурсе могуць прыняць удзел навуковыя работнікі, спецыялісты, аспіранты, студэнты ВНУ — грамадзяне Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 35 гадоў.*

*Тэрмін прадстаўлення матэрыялаў — да 30 кастрычніка 1998 г. уключна.*

*Умовы конкурсу мы публікуем на старонках гэтага нумара газеты "Беларускі універсітэт". Іх можна таксама атрымаць у выканаўчай дырэкцыі Фонду па адрасе: 220072, Мінск, пр. Ф.Скарыны, 66, п.414, 408, а таксама па Інтэрнэце на FTP-сэрверы Фонду: ftp://fond.bas-net.by/ па працоўных днях з 9.00 да 17.30.*

*Тэлефоны для даведак: 284-27-22, 284-18-90, тэл./факс 284-07-42.*

**Умовы конкурсу на суісканне грантаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў для маладых навукоўцаў "Навука-98М"**

*Агульныя палажэнні*

1. Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў (далей у тэксце — Фонд) абвяшчае конкурс на суісканне грантаў для маладых навукоўцаў "Навука-98М" з мэтай прыцягнення таленавітай моладзі да выканання, стварэння дадатковых стымулаў для эфектыўнай навуковай творчасці і павышэння якасці падрыхтоўкі навуковых кадраў.

2. Гранты прызначаюцца на тэрмін да 2 гадоў асобным маладым навукоўцам або групам даследчыкаў на выкананне праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў у разнастайных галінах навукі. Склад групы даследчыкаў не павінен перавышаць 4 чалавекі. Пры гэтым адна і тая асоба можа быць адначасова кіраўніком толькі аднаго праекта па Фонду, а кожны выканаўца мае права па гэтым відзе конкурсаў Фонду атрымаць за ўвесь час не больш за два гранты.

Дубляванне планавай тэматыкі не дапускаецца.

3. Экспертыза праектаў, што паступаюць на конкурс, праводзіцца непасрэдна ў секцыях савета Фонду з прыцягненнем, пры неабходнасці, экспертных саветаў Фонду. Пры разглядзе заявак ацэньваецца:
⇨ актуальнасць тэматыкі, навуковая і практычная значнасць чакаемых вынікаў;
⇨ навуковая кваліфікацыя кіраўніка праекта і ўсяго навуковага калектыву;
⇨ дастатковасць навуковага зачыну і наяўнасць неабходнай навукова-тэхнічнай базы.

4. Фінансаванне працаў па праектах ажыццяўляецца на аснове дагавораў паміж выканаўчай дырэкцыяй Фонду і арганізацыямі-выканаўцамі праектаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

*Патрабаванні да суіскальнікаў грантаў*

5. Гранты Фонду для маладых навукоўцаў прысуджаюцца творча адораным маладым людзям, якія выявілі здольнасці да навукова-даследчай работы і маюць апублікаваныя навуковыя артыкулы.

6. Суіскальнікамі грантаў для маладых навукоўцаў могуць быць навуковыя работнікі, спецыялісты, аспіранты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 35 гадоў.

*Парадак прадстаўлення заявак на гранты*

7. Для ўдзелу ў конкурсе "Навука-98М" неабходна прадставіць у Фонд заяўку, якая ўтрымлівае наступныя дакументы:
⇨ тытульны аркуш заяўкі па вызначанай форме;
⇨ выпіску з рашэння вучонага (навуковага) савета арганізацыі (установы) па асноўным месцы працы суіскальніка, якая ўтрымлівае рэкамендацыю аб допуску заяўкі да конкурсу, ці хадайніцтва, пададзенае акадэмікам альбо членам-карэспандэнтам НАНБ;
⇨ характарыстыку тэматыкі даследавання з указаннем яго мэтаў, навуковага значэння чакаемых вынікаў і іх практычнай значнасці;
⇨ навуковую біяграфію кіраўніка праекта;
⇨ заверany пералік навуковых працаў усіх выканаўцаў праекта і копіі асноўных працаў;
⇨ праект каштарысу выдаткаў з разлікамі. Пры гэтым заработная плата вызначаецца з разліку максімальна 48 (для студэнтаў — 24) мінімальных заработных плат за год на члена калектыву выканаўцаў. Набыццё абсталявання не фінансуецца.

8. Заяўкі падаюцца ў 2-х асобна змацаваных экземплярах (копіі публікацый у 1 экземпляры) у тэрміны, вызначаныя ўмовамі конкурсу. У абавязковым парадку прадстаўляецца таксама дыскета з копіяй файла заявачных матэрыялаў (у фармаце ASCII).

**Тэрміны і ўмовы ўдзелу ў конкурсе**

9. Заяўкі на конкурс прымаюцца з 1 верасня па 30 кастрычніка 1998 года ўключна.

Заяўкі, афармленыя з адхіленнямі ад правілаў або прадстаўленыя пасля абвешчанага тэрміну, да конкурсу не дапускаюцца. Не дапускаюцца замены старонак і змены ў тэксце праекта пасля таго, як ён пададзены.

Інфармацыя аб паступленні ў Фонд і рэгістрацыі заявак выдаецца аўтарам па іх запыце.

Фонд паведамляе толькі канчатковыя вынікі конкурсу, публікуючы спісы падтрыманых праектаў і паведамляючы кіраўнікам праектаў на працягу месяца пасля яго заканчэння.

Прадстаўленыя на конкурс матэрыялы не вяртаюцца.

10. Матэрыялы накіроўваюцца ў адрас выканаўчай дырэкцыі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў: 220072, Мінск, пр.Ф.Скарыны, 66, п.414, тэлефоны для даведак: 284-27-22, 284-18-90, тэл./факс 284-07-42.

Формы заявачных матэрыялаў, а таксама кансультацыі па іх запаўненні могуць быць атрыманыя ў выканаўчай дырэкцыі Фонду ці высланыя на запыт.

Формы заявачных матэрыялаў можна атрымаць па Інтэрнэце на FTP-сэрверы Фонду: ftp://fond.bas-net.by/ па працоўных днях з 9.00 да 17.30.

ГОСЦЬ У ХАТУ

# Лекцыя па-англійску

На мінулым тыдні ў рамках свайго візіту ў Беларусь наведаў універсітэт Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Федэрык Маёр Сарагоса. Ганаровы госць не толькі меў перамовы з кіраўніцтвам універсітэта, але і прачытаў лекцыю для студэнтаў "Культура свету і моладзь". Разам з Генеральным дырэктарам ЮНЕСКА універсітэт наведалі прадстаўнік Беларусі ў гэтай вядомай міжнароднай арганізацыі Уладзімір Сянько і міністр замежных спраў Беларусі Іван Антановіч.

Ад пачатку і да канца прысутныя вялі размову толькі на замежных мовах: англійскай, французскай і іспанскай. Лекцыя гучала цалкам на англійскай. У ёй Генеральны дырэктар ЮНЕСКА спыніўся на глабальным пытанні, ад вырашэння якога без перабольшвання залежыць лёс сусветнага грамадства: якой быць адукацыі ў дваццаць першым стагоддзі. Дарэчы, да вышэйшай адукацыі Федэрык Маёр мае самае непасрэднае дачыненне. Ён — біяхімік па адукацыі, амаль дзесяць гадоў быў прафесарам і рэктарам універсітэта Гранады, потым старшынёй Дарадчага камітэта па навукова-тэхнічных даследаваннях, дырэктарам Інстытута навук аб чалавеку ў Мадрыдзе. Ён таксама даволі працяглы час узначальваў Міністэрства адукацыі і навукі Іспаніі.

Федэрык Маёр — яскравы палітык нашага часу. Свае здольнасці ён праяўляў як член Парламента Гранады, Еўрапейскага Парламента. Яго энцыклапедычная дасведчаннасць, незвычайны арганізатарскі талент не маглі не прынесці яму заслужаную пашану ў свеце: ён абраны членам шэрагу хімічных і біяхімічных таварыстваў, членам Еўрапейскай акадэміі мастацтваў, дакладных і гуманітарных навук, мае вышэйшыя ўзнагароды Калумбіі, Венесуэлы, Францыі. Тры гады Федэрык Маёр быў намеснікам Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА, а ў лістападзе 1987 года яго абралі Генеральным дырэктарам арганізацыі, членамі якой з'яўляюцца 185 краін свету. У тым, што Федэрык Маёр выдатна разумее нацыянальныя і рэгіянальныя праблемы, здольны знаходзіць кампрамісныя рашэнні і ясна бачыць шляхі сусветнага развіцця, тыя, хто прысутнічаў на сустрэчы, запэўніліся самі. Яго лекцыя была багатай на яскравыя і зразумелыя прыклады. Яго адказы на пытанні студэнтаў — ёмістымі і дакладнымі.

Самым нечаканым аказалася тое, што гэты чалавек, які працуе на самым высокім узроўні сусветнай супольнасці, займаецца глабальнымі праблемамі ў галінах адукацыі, навукі, культуры, камунікацыі, паспявае яшчэ захоўваць і развіваць свой паэтычны дар. Нядаўна ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшаў у свет пераклад кнігі яго вершаў "Быць чалавекам". Напрыканцы сустрэчы студэнтка 4 курса факультэта міжнародных адносін Таццяна Варабей прачытала адзін з яго вершаў на беларускай і іспанскай мовах. Яе выступленне Федэрыка Маёра расчуліла. Тое бязмернае пачуццё кахання і павагі да жанчыны, якім прасякнуты яго вершы, праявілася і на гэты раз. Таццяна атрымала з рук Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА шыкоўны букет кветак. А ўсе жадаючыя змаглі сфатаграфавацца з адным з выдатных інтэлектуалаў XX стагоддзя, асобай, чыё мысленне і дзейнасць аказваюць найбольшы ўплыў на сучаснікаў. Вось так, проста, для гісторыі. На прыступках універсітэцкага ганку. А таксама атрымаць аўтограф Федэрыка Маёра на кнізе ягоных вершаў.

СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

# Ля вытокаў беларускай этнаграфіі

*Імёнаў многіх падарожнікаў-беларусаў, пачынаючы з сярэднявечча, няма ні ў адной энцыклапедыі, якія выдаваліся апошнімі дзесяцігоддзямі,— ні ў Вялікай Савецкай, ні ў "малой" беларускай. Таму не дзіўна, што ведаюць іх зусім нямногія. Хіба што спецыялісты-энтузіясты, якія па ўласнай ініцыятыве аддаюць сілы і час на пошукі незаслужана забытых імёнаў. Адзін з такіх энтузіястаў — доктар геаграфічных навук, прафесар Белдзяржуніверсітэта Валерый Аляксандравіч Ярмоленка. Цяпер у яго архіве больш за 300 імёнаў нашых землякоў, якія ў свой час праславіліся як падарожнікі, мараплаўцы, вучоныя-прыродазнаўцы і такім чынам павялічвалі славу... Рэчы Паспалітай ці Расійскай дзяржавы і толькі потым сваю Айчыну — Беларусь.*

*У гэтым нумары рэдакцыя "Беларускага універсітэта" запрашае да ўдзелу ў пастаяннай рубрыцы газеты "Славутыя землякі" вучоных — гісторыкаў і філолагаў, фізікаў і матэматыкаў,— бо не толькі ж на географаў багатая зямля Беларусі. Рубрыку вядзе яе першаадкрывальнік, член Саюза журналістаў Беларусі В.А. Ярмоленка.*

Вядомы беларускі этнограф, падарожнік і публіцыст Павел Міхайлавіч Шпілеўскі нарадзіўся 12 лістапада 1823 года ў вёсцы Шыпілавічы Бабруйскага павета Мінскай губерні ў сям'і святара. Скончыў Мінскую семінарыю і Пецярбургскую духоўную акадэмію. Дасканала валодаў лацінскай, нямецкай і французскай мовамі. Яшчэ падчас навучання ў акадэміі надрукаваў шэраг навуковых прац па этнаграфіі Заходняга края Расіі, склаў "Слоўнік беларускай мовы".

Пасля заканчэння акадэміі малады навуковец прызначаецца выкладчыкам славеснасці Варшаўскага духоўнага вучылішча. У гэты перыяд у Пецярбургу выдаецца яго першая буйная праца "Описание посольства Льва Сапеги в Москву в 1600 году". Кніга, добра ўспрынятая сталічнымі навукоўцамі, падрыхтавана была на аснове рукапісаў, якія Шпілеўскі знайшоў у бібліятэцы Пуслоўскага на Слонімшчыне. У чэрвені 1852 года Шпілеўскі парывае з Варшаўскім вучылішчам і хутка звальняецца з Мінскай кансісторыі.

З 1853 года П.М. Шпілеўскі жыве і працуе ў Пецярбургу. Працяглым і плённым было яго супрацоўніцтва з часопісам "Пантенон", дзе ён выдае серыю этнаграфічных артыкулаў пра беларусаў. У маскоўскім часопісе "Москвитянин" Шпілеўскі выдае каштоўную працу пра беларускія павер'і "Исследования о вурдалаках". У гэтай працы, у прыватнасці, адзначаецца: "На страницах наших журналов постоянно появляются разные исследования о древностях Афин и Рима. А древности Западной России, особенно Беларуси, как будто считаются излишне малозначительными... Беларусь же по справедливости можно назвать столицей древней славянорусской мифологии, там — исток всех языческих верований предков наших".

Шпілеўскі перыядычна ажыццяўляў экспедыцыйныя паездкі па Літве (цяпер Беларусь), Жмудзі (цяпер Літва) і Польшчы. У серыі нарысаў "Путешествие по Полесью и Белорусскому краю" ён дае цікавыя звесткі па гісторыі гарадоў, мястэчкаў і вёсак, апісанне побыту беларускага народа. Гэта багата насычаная гістарычным, этнаграфічным і краязнаўчым матэрыялам праца была хутка выдадзена асобнай кнігай, значная частка якой прысвечана Мінску і Міншчыне. Выдае "Очерки Жмуди" пад псеўданімам "П.М. Древлянский" і вялікую працу "Мозырьщина. С путешествия по западному краю", дзе звяртае ўвагу на самабытнасць беларускай мовы. У артыкуле "Археологические находки", надрукаваным у "Санкт-Петербургских ведомостях" за 1857 год, паведамляе аб адкрыцці Музея старажытнасцяў у Вільні і яго заснавальніку Яўстафіі Тышкевічы. У тым жа годзе Шпілеўскі вядзе ў часопісе "Сын Отечества" сучасны пецярбургскі летапіс — "Дневник знакомого человека", але праз год пераходзіць са сваім летапісам у часопіс "Иллюстрация"; у "Дневнике" — навіны культурнага жыцця, пабытавыя замалёўкі. З 1859 года Шпілеўскі супрацоўнічае ў газеце "Русский мир" і часопісе "Искусство", але найбольш актыўна — у часопісе "Театральный и музыкальный вестник", у якім за тры гады надрукаваў каля 30 артыкулаў. У іх Шпілеўскі асвятляе не толькі тэатральна-музычныя пытанні, але і чыста літаратурныя, выступае абаронцам дэмакратычнай літаратуры гогалеўскай натуральнай школы. Спрабаваў сябе Шпілеўскі і ў белетрыстыцы (апавяданні ў "Современнике" за 1851—1854 гады). Адным словам, ён быў неардынарнай, вартай захаплення асобай.

Улюбёны ў Беларусь і яе мову, вялікі знаўца беларускай гісторыі ды этнаграфіі, П.М. Шпілеўскі лічыў далучэнне Беларусі да Расіі справядлівым актам: "Россия не забрала себе западные губернии как древнюю собственность Польши, а только вернула их себе как испокон веков древние земли русские, захваченные Польшей".

Памёр Павел Шпілеўскі 29 кастрычніка 1861 года і пахаваны ў Пецярбургу. Яго смерць прайшла амаль незаўважна. Толькі пазней з'явіўся кароткі некралог без подпісу ў кніжцы "Месяцеслов на 1863 год".

*В.А. ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*

БІРЖА ПРАЦЫ

# Рабата шукае студэнтаў

Упершыню ў Белдзяржуніверсітэце створаны Цэнтр занятасці Беларускага патрыятычнага саюза моладзі.

Сёння сітуацыя на рынку працы нашай рэспублікі складваецца такім чынам, што студэнцкай моладзі і навучэнцам, а таксама выпускнікам вышэйшых навучальных устаноў, маладым спецыялістам не надаецца дастатковай увагі ў працаўладкаванні па атрыманых у ВНУ спецыяльнасцях, а таксама ў вольны ад вучобы час.

Асноўнай мэтай дзейнасці Цэнтра, якая поўнасцю суадносіцца з рамкамі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў галіне працаўладкавання, з'яўляецца падрыхтоўка моладзі да самастойнага выхаду на рынак працы і паляпшэнне яе матэрыяльнага дабрабыту, дапамога выпускнікам і студэнтам ВНУ Рэспублікі Беларусь у працаўладкаванні. У цесным узаемадзеянні з навучальнымі ўстановамі, цэнтрамі занятасці насельніцтва, прадпрыемствамі, грамадскімі арганізацыямі, мясцовымі адміністрацыямі раёнаў Цэнтр аказвае дапамогу ў працаўладкаванні моладзі на пастаянную і часовую работу, інфармуе аб звестках, якія паступаюць у Цэнтр занятасці ад прадпрыемстваў, устаноў, фірм і іншых наймальнікаў аб вольных працоўных месцах і вакансіях, фарміруе банк дадзеных аб кваліфікаваных спецыялістах, ажыццяўляе сувязь з міжнароднымі маладзёжнымі арганізацыямі па пытаннях працаўладкавання.

У Цэнтры занятасці працуюць студэнты розных факультэтаў Белдзяржуніверсітэта. Створана таксама прэс-служба Цэнтра занятасці. У 1998 годзе плануецца выпуск "Весніка" Цэнтра занятасці БПСМ Белдзяржуніверсітэта. Для рэгістрацыі ў Цэнтры занятасці неабходна мець пры сабе пашпарт, студэнцкі білет ці даведку з месца навучання, адзін фотаздымак 3x4. Пасля рэгістрацыі ў Цэнтры занятасці спецыялісты Цэнтра падбяруць падыходзячае месца працы. Мы чакаем вас па адрасу: вул. Бабруйская, 7, п.304, тэлефон 268-70-98.

*Э. УЛАСАЎ,*
*дырэктар Цэнтра занятасці моладзі БПСМ БДУ*

ДАІ ПАПЯРЭДЖВАЕ

# Дарогам — бяспеку і парадак!

Складаная абстаноўка з дарожнай дысцыплінай склалася ў жніўні ў нашай рэспубліцы. Толькі за першыя дзесяць дзён месяца ў дарожна-транспартных здарэннях (ДТЗ) загінулі 78 чалавек, а раненні атрымалі 210. Штодзённа па краіне затрымліваецца да 3020 чалавек за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане.

У мэтах прафілактыкі гібелі і траўматызму людзей на дарогах з 1 па 30 верасня праводзіцца аперацыя "Дарогам — бяспеку і парадак!".

У спісах парушальнікаў дарожнай дысцыпліны ёсць і супрацоўнікі і студэнты БДУ. Так, перавысіў хуткасць руху выкладчык Дз. М. Калеснік, а таксама студэнты А. Саладуха, А. Аляб'еў, І. Хамічкоў, А. Буйневіч.

У п'яным выглядзе за рулём затрыманыя студэнты В. Місюк і І. Ксяндзова. Парушальнікамі ПДР з'яўляюцца таксама студэнты А. Галкін, А. Трусь, Дз. Лабасты, Дз. Лісюк, У. Старук.

Памятайце, што бяспека на вуліцах і дарогах залежыць ад кожнага з нас! ДАІ зычыць вам здароўя, поспехаў у працы і вучобе ў новым навучальным годзе!

*Д. ЗАБАЛУЕЎ,*
*старшы інжынер ДАІ Маскоўскага раёна*

КАНІКУЛЫ

# "Бе-Ла-Русь" прымала гасцей

З 23 па 26 ліпеня традыцыйна і ўжо ў сёмы раз ля кургана Дружбы, што на мяжы трох дзяржаў: Беларусі, Латвіі і Расіі — праходзіў міжнародны маладзёжны лагер "Бе-Ла-Русь". На гэты раз ён быў арганізаваны на беларускай тэрыторыі.

Праграма лагера была вельмі насычанай: спартыўныя спаборніцтвы, КВЗ, круглыя сталы, дыскусіі, дыскатэкі да раніцы, конкурсы, а таксама канцэрты зорак беларускай эстрады Стэлы, Уладзіміра Станкевіча і Анжэлікі Ют.

*Аляксандр ЛАБКОЎ*

ТЭСТ

# Бал па паводзінах

Новы навучальны год для студэнтаў і выкладчыкаў азначае яшчэ і замену групы людзей, з якімі яны мелі зносіны у мінулым семестры, на новую. Хаця б часткова. У інтэрнаце ці універсітэцкай аўдыторыі. І хаця псіхолагі даўно вызначылі, што многія канфлікты і непаразуменні паміж людзьмі звязаны з іх псіхалагічнай несумяшчальнасцю паміж сабой, тыя ж псіхолагі раяць у такіх выпадках быць проста больш уважлівымі да навакольных і часам займацца самавыхаваннем. Што мы вам і прапануем.

Пададзеныя ніжэй дзесяць сцвярджэнняў апісваюць некаторыя рысы паводзін, у пэўнай ступені характэрныя для розных людзей. Ваша задача — ацаніць, наколькі кожнае з іх правільнае адносна вас. Калі тое ці іншае сцвярджэнне вы прымаеце цалкам, пастаўце 1 бал, калі яно правільнае толькі ў пэўнай ступені альбо непрымальнае для вас зусім — пастаўце 0 балаў.



**Галоўнае — добры настрой**

1. Пакідаю за сабой апошняе слова.
2. Нярэдка ў гутарцы перапыняю суразмоўцу.
3. Мяне лёгка разздаваць.
4. Люблю рабіць заўвагі іншым.
5. Хачу быць аўтарытэтам для ўсіх.
6. Не задавольваюся малым у дасягненні якой-небудзь мэты, хачу дасягнуць найлепшых вынікаў.
7. Калі разззлуюся, то ледзь сябе стрымліваю.
8. Больш люблю кіраваць, чым падпарадкоўвацца.
9. У мяне рэзкая, грубая жэстыкуляцыя.
10. Я помслівы.

А цяпер у залежнасці ад сумы набраных балаў вызначце варыянт паводзін, якому вы аддаяце перавагу.

**Больш за 7 балаў.** Вам неабходна сур'ёзна заняцца самавыхаваннем. Ваша манера паводзінаў непрыемная для тых, хто вас атачае, і яна выклікана хутчэй за ўсё вашым нядобразычлівым стаўленнем да людзей. Вы паводзіце сябе часта груба і задзірліва, імкнецеся заўсёды даказаць сваю перавагу ва ўсім. Калі вы не маеце рацыі, то не прызнаецеся ў гэтым нават сабе самому, імкнецеся пры гэтым абвінаваціць у тым, што здарылася, іншых.

**3-7 балаў.** Вашы паводзіны дастаткова разнастайныя, і адносіны людзей да вас залежаць хутчэй ад вашых паводзін цалкам. Аднак майце на ўвазе, што калі вы набралі больш за 5 балаў, то бліжэй да першай характарыстыкі паводзін, а калі 5 балаў і менш — да апошняй.

**1-2 балы.** Вы спакойны, "ціхі" чалавек, імкнецеся пазбягаць канфліктаў і спрэчак. Нягледзячы на тое, што такія паводзіны могуць быць ад нежадання зрабіць непрыемнае для тых, хто вас атачае, людзі могуць ставіцца да вас з пагардай і лічыць чалавекам "мяккацелым", які не ўмее пастаяць за сябе і заўсёды слухаецца толькі іншых. Такая манера паводзін можа вам пашкодзіць.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.*
*Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана на паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" ВПП імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны завул., 3*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00*

14 ВЕРАСНЯ
Зак. 1439
Т. 1000 экз.
Бясплатна

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 3, пакой 307, тэлефон 2206827.*

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Калюты В.Г.*